№ 174 (1238)

Аўторак, 18 верасня 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 120 руб.,
у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па краіне захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, у паўднёва-заходніх раёнах — кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-ўсходні, 6—11 м/с, месцамі парывы да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ў Гродне — +16...+18, Брэсце — +17...+19, Магілёве — +17...+20, Мінску — +20...+21, Гомелі каля +22.

У наступныя двое сутак чакаецца пераменная воблачнасць, 19-га па паўднёвым захадзе, 20-га ў цэнтральных раёнах кароткачасовыя дажджы. Вецер усходні, 6—11 м/с, парывы да 14. Тэмпература паветра 19-га ўначы — +8...+13, удзень — +15...+22, 20-га ўначы — +6...+11, удзень — +14...+19.

Іх лёс хвалюе Беларусь!

Юрый ЗАХАРАНКА



863 дні таму знік.

Віктар ГАНЧАР



731 дзень таму знік.

Анатоль КРАСОЎСКІ



731 дзень таму знік.

Дзмітрый ЗАВАДСКІ



435 дзён таму знік.

Андрэй КЛІМАЎ



1314 дзён за кратамі.

Прэзідэнту
Злучаных Штатаў Амэрыкі
Джорджу Бушу

Спадар прэзідэнт!

Выказваем глыбокае спачуваньне Вам і ўсяму амэрыканскаму народу ў гэту цяжкую гадзіну. Мы з Вамі смуткуем і лічым, што гэтая трагедыя больш паяднае ўсіх людзей Зямлі, якія хочуць аднапалярнага сьвету, у якім ня будзе супрацьстаяньня людзей і дзяржаў, ня будзе дыктатур і дыктатараў, а будзе Босская філясофія.

Ад супольнасьці фірмы "Даўмонт"
Ян ДАЎМАТОВІЧ.

г.Салігорск.

ПОЗОР

ЖИВОТНЫЙ СТРАХ

Марина КОКТЫШ

В конце марта этого года некоторым членам Палаты представителей и Совета республики "Народная воля" задала вопрос: **"Что лично Вы предприняли для того, чтобы власти скорее пролили свет на судьбы пропавших людей?".** Ответы политиков шокировали однотипностью и цинизмом: *"Я не занимаюсь политикой, я — человек искусства", "Не впутывайте меня в политику", "А почему я должен заниматься этим вопросом?"*. Тогда многие из них искренне обиделись на справедливый комментарий, в котором "Народная воля" назвала их марионетками. Потому что известные и даже знаменитые, они ничем не выделяются в сомнительных "палатах", верхних и нижних, ибо стали частью единого механизма — той авторитарной системы, которая уже восьмой год действует в стране. Прошло полгода. Обнародованы рапорты генерала Лопатика и полковника Алкаева. На видеокассетах заговорили некоторые свидетели убийств Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского. Однако попрежнему молчат те, кого обвиняют в уничтожении этих людей.

Как теперь реагируют на новые подробности "громких исчезновений" так называемые депутаты? Что собираются предпринять? В канун очередной годовщины исчезновения В.Гончара и А.Красовского с этими вопросами мы обратились к тем, кто публично считает себя демократом — члену постоянной комиссии Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь по законодательству и судебно-правовым вопросам **Ольге АБРАМОВОЙ** и члену комиссии по государственному строительству, местному самоуправлению и регламенту **Владимиру НОВОСЯДУ.**

Ольга Михайловна без особого энтузиазма отреагировала на просьбу, хотя от разговора не отказалась.

— У вас всегда очень интересные заголовки, я отдаю должное вашему журналистскому мастерству и постановке вопросов, — начала Абрамова. — Но появляются комментарии, которые задают рамочные условия, и в результате получается далеко не то, что ты в реальности говорил.

— Вашу речь мы никогда не искажали, приводили дословно. А комментарии — это наше право.

— Правильно. А когда потом у вас появляется заголовок нечто вроде (я уже не помню, как дословно) — "Позор нации"... Это вот я позор, другие позор, вы знаете... Мягко говоря, это вызывает "приятное" чувство удивления... Выражаю свое восхищение.

— Ольга Михайловна, можно мы все-таки перейдем к вопросам?

— Да, пожалуйста.

— 16 сентября исполнилось два года, как пропали Виктор Гончар и Анатолий Красовский. Вы в Палате представителей олицетворяете, скажем так, демократов...

— Нет, я олицетворяю позор нации, судя по вашей газете.

—...После того как в прессе были опубликованы рапорты генерала Лопатика и полковника Алкаева, как депутат Вы пытались проявить интерес к этим делам, скажем, узнать, как продвигается расследование?

— Безусловно. Интерес этот у меня есть с момента исчезновения этих людей. Тем более что большинство из пропавших я знаю лично, и меня их судьба волнует чисто по-человечески. Но хочу повторить вам еще раз: в оперативно-розыскную деятельность лично я как депутат вмешаться не имею права. И вообще, мне кажется, что кроме того, что делается на уровне массовой кампании, делается справедливо для привлечения внимания общества. Беларусь остро нуждается в создании системы законодательства по гражданскому контролю за деятельностью силовых структур. Я над этим работаю с 1997 года. И ситуация, при которой общество не имеет информации по столь животрепещущим вопросам, не была бы возможна, если бы такое законодательство в Беларуси существовало и действовало. И такие предложения я делала с 1997 года. В том числе обращалась к руководителям ряда оппозиционных партий. И никто из них не поддержал необходимость разработки такого законодательства, за исключением, если мне не изменяет память, Павла Козловского. В этом направлении я буду продолжать работать.

К тому же у меня была встреча по этому же вопросу с Наумовым, но в интересах следствия, к сожалению, говорить о том, что мы обсуждали в течение полутора часов, я не могу.

— Если не ошибаюсь, Лукашенко в одном из своих выступлений пообещал включить Вас в депутатскую комиссию, которая якобы будет курировать расследование громких дел...

— Если честно, я не слышала этого выступления. Но, насколько мне известно, мне было предложено как бы, если будет эксгумация, то присутствовать при эксгумации.

— При эксгумации трупов Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского?

— Я шучу.

— Это шутка?!



Ольга АБРАМОВА



Владимир НОВОСЯД

— Вот что я хочу сказать: я вам свою позицию обозначила. Буду продолжать работать по тем направлениям деятельности, по которым считаю нужным работать. Я считаю, что должны быть изменены рамочные условия подхода к рассмотрению подобных вопросов. Но при этом без права вмешательства в оперативно-розыскную деятельность. Журналисты могут проводить свои журналистские расследовния. Общественность узнает какие-то вопросы, адекватно или неадекватно, в освещении журналистов. До тех пор, пока мы не добьемся парламентского контроля за деятельностью силовых структур, причем надо тоже воспринимать это соответственно так, как это есть в развитых странах. Мы имеем право на получение информации, в то же время не препятствуя специфической деятельности силовых структур на этом направлении. Здесь нужно работать именно по этому направлению. И еще. Нет ничего тайного, что когда-либо не стало бы явным. Наберитесь терпения. Это все, что я могу вам сказать.

...Владимир НОВОСЯД попросил все адресованные ему вопросы изложить в письменном виде и сбросить по факсу: *"Я завтра приду на работу, отвечу и вам их отправлю"*. Новосяд также потребовал, чтобы его ответы были опубликованны именно в том виде, в котором будут написаны. Вплоть до сохранения авторских знаков препинания. Без всяких оскорбительных комментариев и провокационных заголовков. "Народная воля" гарантировала напечатать все в нетронутом виде. Даже без корректорских правок. Однако на следующий день Владимир Владимирович категорически отказался ответить на сформулированные вопросы, заявив: *"Факс я получил. Но все, что я хотел сказать по этому поводу, я уже давно сказал с парламентской трибуны. Когда мне есть что сказать, я всегда пользуюсь трибуной"*. И продолжил: мол, только благодаря мне почти все независимые журналисты получили аккредитацию в Овальный зал, 2 октября начинается сессия, приходите на заседания, слушайте выступления депутатов и пишите материалы. *"А на вопросы, поймите меня правильно, я отвечать не буду. И вообще, мне не хотелось бы продолжать этот бессмысленный диалог"*, — отрезал Новосяд и положил трубку.

Анатолий Лебедько, председатель Объединенной гражданской партии, сказал, что региональная организация, в рядах которой состоит Владимир Новосяд, уже несколько раз инициировала вопрос об исключении "палаточника" из рядов ОГП. "Однако руководство партии посчитало, что в данный момент это не является приоритетным для деятельности Гражданской партии. У нас есть другие более важные задачи. Хотя этот вопрос не может долго находиться в стадии ожидания. Думаю, руководство партии в данном случае просто займет нейтральную позицию и вообще отдаст этот вопрос на откуп региональной организации, в которой состоит Владимир Новосяд.

Хочу заметить, что поведение Новосяда ни в коем случае не говорит о том, что далеко не все члены ОГП поддерживают акцию "Цепь неравнодушных людей", инициатором которой является ОГП. Новосяд — единственный, кто занимает такую позицию".

Кстати, вот перечень вопросов, который почему-то смутил или испугал молодого и некогда отважного депутата Новосяда:

— В свое время в Министерство внутренних дел Вы направили депутатский запрос с просьбой проинформировать Вас, имеются ли подозреваемые по уголовным делам, возбужденным по факту исчезновения белорусских политиков. После того, как в прессе были опубликованы рапорты генерала Лопатика и полковника Алкаева, подлинность которых подтвердил министр Наумов, Вы не пытались с ним встретиться и узнать, как продвигается расследование?

— Почему бы Вам не направить аналогичный депутатский запрос нынешнему Генеральному прокурору Беларуси Виктору Шейману, которого подозревают в причастности к убийствам Гончара и Красовского?

— После первой встречи с министром Наумовым Вы были уверены, что все эти люди живы. После ознакомления с рапортами по-прежнему в это верите?

— В интервью "Народной воле" Вы заявили: "Лично я выполню все от меня зависящее, чтобы скорее узнать правду о похищении Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского. Буду и дальше каким-то образом способствовать раскрытию этих дел". Если не секрет, что собираетесь предпринять в ближайшем будущем?

— Вы общались с женами пропавших? С кем именно?

— 16 сентября — два года с того дня, как пропали Гончар и Красовский. Что за это время Вы как человек, политик и депутат сделали для того, чтобы власти пролили свет на судьбы этих людей?

Непонятно, что так злит некоторых политиков, когда к ним обращаешься с вопросами о судьбе Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского. Собственная беспомощность и бессилие? Причастность к власти, которую обвиняют в убийствах? Животный страх ляпнуть что-то не то, впасть в немилость и пополнить ряды исчезнувших?

У некоторых депутатов тема пропавших превратилась в хороший повод для шуток. Страшных и циничных.

Многие считают, что 9-е сентября похоронило тему исчезнувших политиков. Если не навсегда, то по крайней мере до следующих президентских выборов. А потому пока можно праздновать победу. Спокойно глушить водку, упиваться властью и посылать всех подальше. И наконец-то засыпать без димедрола и нервной дрожи в коленках.

Но однажды неизбежно придется держать ответ. В том числе и нынешним "палатникам". Если не в первую, то во вторую очередь.

В Беларуси не будет спокойствия, пока люди до мельчайших подробностей не узнают, что случилось с Захаренко, что случилось с Гончаром и Красовским, что случилось с Завадским, другими внезапно исчезнувшими известными и малоизвестными гражданами.


В Беларуси не будет спокойствия, пока хоть один убийца будет на свободе.

ПАЗІЦЫЯ

Васіль БЫКАЎ:

"Жульніцкія і шулерскія прыёмы мелі месца на прэзідэнцкіх выбарах..."

Як мы ўжо паведамлялі, днямі знакаміты беларускі пісьменнік Васіль Быкаў сустрэўся ў Празе з прэзідэнтам Чэхіі Вацлавам Гавелам. Адразу пасля сустрэчы карэспандэнт радыё "Свабода" узяў у Быкава інтэрв'ю. З некаторымі скарачэннямі мы друкуем яго на старонках "Народнай волі".



— Васіль Уладзіміравіч, што для Вас было найбольш істотным у гутарцы з Гавелам?

— Прэзідэнт Гавел найбольш цікавіўся вынікамі нядаўніх прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Вынікі гэтыя яго, мяркуючы па ўсім, здзівілі, як здзівілі яны і дэмакратыю ўсяго свету. І ён жадаў удакладніць, наколькі гэтыя лічбы адпавядаюць сапраўднасці. Я, канешне, не мог задаволіць гэтай цікавасці прэзідэнта, таму што я не ведаю сапраўднай цаны гэтых лічбаў і як яны здабываліся. Ды, відаць, гэтага не ведае ніхто. Таму што жульніцкія і шулерскія прыёмы, натуральна, не раскрываюцца. А яны, безумоўна, мелі месца ў беларускіх выбарах, і гэтым вельмі занепакоены і Чэхія, і наогул Еўропа. Былі таксама зададзены і іншыя пытанні, галоўным чынам пра палітыку і эканамічнае развіццё Беларусі.

— Калі гаварыць пра нейкае будучае супрацоўніцтва Беларусі з Чэхіяй, у якіх галінах, якія сектары грамадства маглі б супрацоўнічаць?

— Маглі б супрацоўнічаць пры добрай волі двух бакоў усе сектары грамадства, якія толькі ёсць у Беларусі і ў Чэхіі. Таму што з боку Чэхіі ў наяўнасці гэтая воля і гэтае жаданне. Чэхі памятаюць сваё нядаўняе мінулае, як яны столькі гадоў былі, па сутнасці, у рэжыме акупацыі адной вялікай звышдзяржавы, і таму яны вельмі адчуваюць патрэбу Беларусі ў дэмакратычным развіцці. Але ёсць рэчы, якія не даюць рэалізавацца такой магчымасці. І гэта непакоіць Чэхію.

— Вацлаву Гавелу належыць выказванне, і нават гэта назва яго кнігі — "Сіла бяссільных". Вы, Васіль Уладзіміравіч, каменціруючы тэрарыстычную атаку на ЗША, ужылі формулу "абмежаванасць Дабра і ўсемагутнасць Зла". Іншымі словамі, Вы з Гавелам глядзіце супрацьлегла на гэтую праблему. Ці не падаецца Вам, што той лік, якім скончылася XX стагоддзе, усё ж на карысць Дабра і бяссільных? Але, я нагадаю — двойчы пацярпелі паразу ў сусветных войнах агрэсары, якія пачыналі гэтыя войны. А напрыканцы стагоддзя ў "халоднай вайне" пацярпела паразу і камуністычная "імперыя Зла". Ці не дае гэта падставу для глабальнага аптымізму? Я Вам задаю гэтае пытанне ў дзень, калі Амерыка толькі яшчэ разграбае развалiны, пад якімі ляжаць ахвяры...

— Я думаю, што ўсё ж такі для глабальнага аптымізму час яшчэ не настаў. Яшчэ рана радавацца з нагоды таго, што XX стагоддзе скончылася без вялікіх войнаў. Справа ў тым, што Зло — яно перамяшчаецца, відаць, у сусветнай сферы з аднаго полюса на другі. І калі бачна, што яно пераможана на адным полюсе, дык гэта не значыць, што яно сапраўды знікла. Яно існуе, і будзе існаваць, відаць, пакуль будзе існаваць чалавецтва. Яно перасоўваецца, прымае іншую форму, іншае аблічча. Вось паглядзіце: скажам, безумоўны набытак нашай цывілізацыі, хрысціянскай цывілізацыі — гэта дэмакратыя. І як гэтую дэмакратыю навучыліся выкарыстоўваць зусім іншыя сілы, сілы антыдэмакратыі. Здабылі такую магчымасць апранацца ў мантыю дэмакратыі і праводзіць сваю антыдэмакратычную палітыку. А цяпер мы бачым, як з дэмакратычнага Захаду Зло, дзе яно, мабыць, не знаходзіць ужо дастатковых сродкаў і спосабаў для сваіх спраў, яно перамясцілася на арабскі Усход, у "трэці свет". Але яно не знікла. І, я думаю, яно і не знікне, бо гэтае Зло, як, дарэчы, і Дабро — проста ў прыродзе чалавека.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

АНОНС

Письма из Америки



С чувством глубокого удовлетворения славянский мир узнал о снижении курса доллара по сравнению с евро и иеной. Сказалась давняя национальная привычка тихо радоваться чужой беде. Еле заметную подвижку американских денег, однако, бедой для единственной супердержавы мира назвать нельзя даже с большой натяжкой. "Не дождетесь!" — отвечал в таких случаях старый еврей соседям на их озабоченность его здоровьем.

Постойте, не согласитесь вы, но это же правда, что по отношению к евро и иене доллар подешевел, соответственно, на 7,5 и 2,8 процента. Правда, соглашусь я. Несовершенный "Запорожец" на каком-то этапе 100-километрового марафона тоже способен немного обойти мощный "Мерседес". Ну, повезло там, соперник зазевался... В целом же такая сложная и тонкая сфера, как экономика, чудес не признает. Ошибки — да. Просчеты — да. Провалы — да. А уж успехи так и совсем приветствует. Америка сейчас переживает нелучшие времена — замедлились темпы промышленного роста, упала стоимость акций крупнейших кампаний на Нью-Йоркской бирже, поубавилось инвесторов, импорт превысил экспорт. И наконец — невиданная трагедия 11 сентября 2001 года. Все это обоснованно заставило Белый дом взволноваться. Но объективно экономика США сегодня самая сильная в мире и, уверяю, останется такой еще долго.

Жалко, что не живем мы в старые коммунистические времена. А то свои письма из Америки на этот раз я непременно предварил бы самой любимой рубрикой всех советских газет — "Адреса передового опыта". Благо, адреса известны, опыт имеется, а судя по уровню жизни американского общества — самый что ни есть передовой. Да вот беда. Перенимать в Беларуси некому. Она ведь идет собственным путем. И называется он, кажется, рыночный социализм.

Если это не белая горячка в ее классическом проявлении, то Соединенные Штаты Америки в таком случае тоже построили новое общество — капиталистический коммунизм.

Добро пожаловать в рай, господа нищие!

Леонид АНОП,
собственный корреспондент "Народной воли" в Соединенных Штатах Америки.

("Народная воля" начинает публикацию цикла аналитических очерков нашего корреспондента в США о структурных изменениях в американской экономике. Первый материал читайте на 3-й странице сегодняшнего номера газеты.)

Народная Воля 18 ВЕРАСНЯ 2001 г.

"Пагоню" трымаюць у пракурорскіх цуглях

Ужо два тыдні запар не выходзіць у свет адна з самых вядомых незалежных беларускіх газет — гродзенская "Пагоня".

Нумар "Пагоні", змест якога так напалохаў мясцовыя ўлады, бо не адпавядаў афіцыйнаму пункту гледжання на прэзідэнцкія выбары, не быў адрукаваны нават звычайным тыражом. І, канечне, не павялічаным да 88 тысяч, як планавала рэдакцыя. Дарэчы, усе пытанні па выхадзе гэтага нумара былі ўзгоднены з кіраўніцтвам абласной друкарні, паклапацілася "Пагоня" і пра неабходную колькасць паперы. Нішто на дзяржаўным паліграфічным прадпрыемстве не перашкаджала нармальнай працы над прымеркаваным да выбараў нумарам незалежнай газеты, акрамя тэрміновай і зноў-такі канспіратыўнай, як незаконная цэнзура, забароны адпаведных уладных структур на друкаванне небяспечнай "Пагоні". Мікола Маркевіч упэўнены, што такі, відаць, тэлефонны загад адразу атрымала кіраўніцтва друкарні, хоць яе дырэктар Таццяна Міронава і вымушана спасылацца не на адвольную забарону, а на нейкія тэхнічныя, быццам бы, складанасці.

У адрозненне ад ініцыятараў гэтага таямнічага загаду, непасрэдных яго выканаўцаў і ўдзельнікаў апэрацыі па знішчэнні незалежнай газеты імёны свае неяк не даводзілася [illegible]. Так, крымінальную справу супраць галоўнага рэдактара "Пагоні" ўзбудзіў першы намеснік пракурора вобласці Уладзімір Аніська. Вобыскам у памяшканні газеты, што адбыўся напярэдадні выбараў і ў выніку якога рэдакцыя пазбавілася сваіх камп'ютэраў і бухгалтарскай дакументацыі, кіраваў Альфрэд Танкевіч, старшы следчы пракуратуры Ленінскага раёна г.Гродна. Удар быў моцным, але супрацоўнікі рэдакцыі яго вытрымалі, здолелі таксама падрыхтаваць наступны нумар "Пагоні" — як аказалася, штотыднёвік. Аднак і ў гэты, мінулы чацвер, апальнай газеце не дазволілі дайсці да чытачоў. У баявых дзеяннях супраць "Пагоні" былі кінуты новыя пракурорскія сілы.

— І на гэты раз падзеі разгорталіся імкліва, — расказвае Мікола Маркевіч. — У сераду зранку давядаўся, што пракуратура арыштавала ў друкарні рэшткі грошай і паперы да папярэдняга нумара "Пагоні", які павінен быў выйсці 88-тысячным тыражом. Давялося дзіўна, бо грошы гэтыя нам усё не належалі, яны яшчэ 3 верасня былі пералічаны на рахунак друкарні. Прыйшлося зноў перадаваць грошы і тэрмінова шукаць паперу. А ў рэдакцыі мяне тым часам чакала чарговая непрыемная вестка: 27 верасня Вышэйшы Гаспадарчы суд рэспублікі будзе разглядаць справу аб закрыцці "Пагоні". Па іску абласной пракуратуры, які падпісаў намеснік пракурора вобласці Юрген Трушко. І позву атрымаў на допыт да следчага абласной пракуратуры Алега Кулевіча. Да канца дня [illegible] гэты нумар газеты. Але... дарэмна. Увесь адрукаваны тыраж пайшоў пад нож. На падставе, як "патлумачылі" мне ў пракуратуры, крымінальнай справы ад 5 верасня, па 36-м нумары "Пагоні". А якія адносіны да гэтай справы, пытаюся, мае 37-ы нумар? Толькі затым даведаўся, што пракуратуру насцярожыў верш, які мы падалі ў "мове арыгінала": "Абешчал, абящчаю и буду абящчать...". Калі Алег Кулевіч ды іншыя пракурорскія работнікі лічаць, што [illegible]

Запытанні ў пракуратуры [illegible] "Пагоні" [illegible]

— Падчас вобыску ў мяне адбыўся вельмі цікавы дыялог з Алегам Кулевічам, — гаворыць Мікола Маркевіч. — Калі я пасярэдзіўся на тое, што пракуратура [illegible] "Як вы будзеце выконваць законы, калі ... "Пасведчанне і цікава, што [illegible]", — адказаў Алег Кулевіч.

Вось такое разуменне свабоды слова [illegible]

Вячаслаў БАЛАМУТ.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Не надо изобретать велосипед, путь из западни давно известен

Размышления о том, почему страна получила Лукашенко и как вывести нашу экономику из кризиса



Анатолий СТАНКЕВИЧ, экономист

Пятьсот лет назад Никколо Макиавелли с болью в душе писал о своей родине: "Как некогда народу Израиля надлежало пребывать в рабстве у египтян, дабы Моисей явил свою доблесть, персам — в угнетении у мидийцев, дабы Кир обнаружил величие своего духа, афинянам — в разобщении, дабы Тезей совершил свой подвиг, так и теперь, дабы обнаружила себя доблесть италийского духа, Италии надлежало дойти до ее нынешнего позора, до большего рабства, чем евреи, до большего унижения, чем персы, до большего разобщения, чем афиняне. Нет в ней ни главы, ни порядка; она разгромлена, разорена, истерзана, растоптана, повержена в прах".

Кто из нас за последние семь лет не испытывал аналогичные чувства; боль за родину, бессильную ярость и жгучий стыд?

Тяжелая проблема Беларуси — люди старшего и среднего возраста. Именно в нашей стране большевики достигли максимального эффекта в советизации массового сознания. Приватизация государственной собственности в ней по этим причинам вопрос не столько экономический, сколько политический. Это совсем не означает, что нужно заморозить эту проблему до подхода к избирательным урнам новых поколений. Здесь уместен совет опытного Вацлава Клауса своим относительно молодым восточно-европейским коллегам. Он начинал свою реформаторскую миссию в Чехии в команде Дубчека в 1967 году. Вот что он заметил: "Я говорил Бальцеровичу, он меня не слушал, теперь говорю вам — все эти экономические тонкости интересны и по большому счету нам понятны, но если вы не сумеете создать политическую базу поддержки рыночных реформ, то навсегда останетесь их заложником. Это очень легко может перечеркнуть все, что вы делаете или собираетесь делать... Как часто вы выступаете в аудиториях, перед публикой, объясняете свои взгляды, убеждаете? Редко? А я вот не жалею для этого времени, делаю это несколько раз в неделю".

Вот универсальный ответ на вопрос, что делать с приватизацией? Каждый факт, когда вчерашний чиновник, госдиректор или члены их семей становятся владельцами объектов приватизации в психологически неподготовленном социуме — это яма под жизненно важным для страны процессом. И когда количество ямок достигнет критической массы, страна получает своего Лукашенко. Есть ли выход? Есть. Воплощать в жизнь советы Маргарет Тэтчер и Вацлава Клауса и умело контролировать, чтобы советы умных людей в процессе рутинной работы не доводились до абсурда.

Очень помогает свободная пресса. Твердо убежден: если кого и освобождать от налогов, так это журналистов и издателей средств массовой информации. В первую очередь телевидения и радио. Это одно из важнейших условий реформ. Неудачная стратегия в области средств массовой информации — гарантия их провала.

В сфере экономической политики первыми должны быть шаги, направленные на сбалансирование спроса и предложения на ресурсных, товарных и финансовых рынках... А в гражданском кодексе должна быть предусмотрена надежная защита свободного ценообразования от любителей порегулировать цены.

Физический износ основного капитала промышленности Беларуси на 1 января 2001 года составляет от 75 до 90 процентов, а если в качестве критерия рассматривать моральный износ (а именно этот критерий лежит в основе конкурентоспособности), можно смело констатировать: белорусской индустрии уже нет. Реновационные фонды использованы не по назначению, в основном на текущие нужды. Ресурсы для "левой политики" в реальном секторе использованы А.Лукашенко до конца. Выход из этой западни — только прямые иностранные инвестиции. Но тогда придется принимать правила игры инвесторов.

По монетарной проблеме нужна дискуссия профессионалов. Введение в Беларуси не одной, а нескольких валют одновременно, как с фиксированным, так и с плавающим курсом, не кажется мне утопией независимо от того, какая будет реализована институциональная система: валютное управление, центральный банк или система свободных банков; каким будет курс: фиксированный или плавающий; каким будет плавание: — чистым или грязным, какой предпочтем якорь: доллар, евро или швейцарский франк. В денежную политику должны быть заложены простые и обязательные к исполнению принципы: прозрачность, бездефицитность и жесткие бюджетные ограничения. Стабильность национальной банковской системы будет, на мой взгляд, гарантирована присутствием на рынке западных банков.

Население страны с 1992 года прошло обучение самовыживанию в условиях минимума реальной государственной защиты, но с мощным психологическим давлением популизма в качестве анестезии. Интересно, где находится предел терпения у людей с деформированной тоталитаризмом психикой? Проблемные вопросы социальной политики после семи лет популистского правления должны широко обсуждаться, и в первую очередь на телевидении.

Чем меньше ресурсов в силу бедности страна может направить в социальный сектор, тем богаче, ярче и свободнее должна быть духовная жизнь людей. Социальные системы: пенсионная, здравоохранения, образования, программы помощи — не соответствуют современным мировым тенденциям. Трансферты на учебу, лечение и адаптационные программы должны получать люди, а социальные учреждения должны конкурировать за право предоставить платную услугу обладателю трансферта.

Еще об одной проблеме, без удовлетворительного решения которой нет смысла рассчитывать на устойчивый и здоровый рост экономики — о доверии. О доверии в широком смысле этого слова: граждан к правительству и к государственным институтам, к банкам и к национальным деньгам, к законам и подзаконным актам, к рынку и к демократии. О доверии — как о внутреннем факторе национальной жизни, наполненной уважением к своим соотечественникам и к своим предкам, к языку и культуре своей нации, неразрывной частицей которой себя ощущаешь. Только на фундаменте такого внутреннего доверия рождается доверие окружающего мира к стране: влиятельных иностранных политиков, международных финансовых организаций и банков, страховых компаний и рейтинговых агентств и на последнем этапе — инвесторов.

Подводя итог разговору, констатируем: чем дальше на Восток от Западной Европы, тем ниже качество менеджмента и сильнее ностальгия по прошлому, слабее структурная и технологическая политика и тоньше поток инвестиций, ниже стандарты этики и корпоративной культуры, выше политические и коммерческие риски и минимален доступ к еврорынкам. Вот в чем причины бед и одновременно подсказка пути к успеху.

Беларуская асацыяцыя журналістаў звярнулася ў пракуратуру

Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) звярнулася ў Пракуратуру Беларусі з просьбай тэрмінова спыніць парушэнне правоў незалежных выданняў, а таксама прыцягнуць да адказнасці першага намесніка старшыні Дзяржкамітэта па друку Уладзіміра Глушакова, які адначасова выконвае абавязкі дырэктара прыватнай друкарні "Мэджык" і "ўзяў на сябе функцыі цэнзара".

У Беларускую асацыяцыю журналістаў, гаворыцца ў заяве, звярнуліся галоўныя рэдактары газет "Народная воля" — Іосіф Сярэдзіч, "Беларуская маладзёжная" — Таццяна Мельнічук, "Рабочы" — Віктар Івашкевіч і "Предпринимательской газеты" — Глеб Багамолаў. Яны паведамілі, што першы намеснік старшыні Дзяржкамдруку Уладзімір Глушакоў спрабуе выконваць функцыі цэнзара і ўмешваецца ў дзейнасць выданняў. Напрыклад, 28 жніўня Глушакоў сарваў выпуск газеты "Рабочы", а 31 жніўня з "белымі плямамі" выйшлі два спецвыпускі "Предпринимательской газеты". 5 верасня Глушакоў запатрабаваў зняць некаторыя артыкулы з нумароў "Народнай волі" і "Беларускай маладзёжнай", пагражаючы забараніць друкаванне накладу. 7 верасня з "белымі плямамі" выйшаў чарговы нумар "Народнай волі" — зняць матэрыялы з нумару, падпісанага ў друк галоўным рэдактарам выдання Іосіфам Сярэдзічам, таксама запатрабаваў Глушакоў.

У сваёй заяве ў пракуратуру БАЖ разглядае дзеянні першага намесніка Дзяржкамдруку як парушэнне патрабаванняў Канстытуцыі і закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". У прыватнасці, артыкул 33 Канстытуцыі гарантуе кожнаму свабоду думак, перакананняў і вольнае іх выказванне. Цэнзура, як указваецца ў гэтым артыкуле, не дапускаецца.

БАЖ заяўляе: "Згодна з артыкулам 48 Закона аб друку, дзеянні Глушакова ёсць уціск на свабоду масавай інфармацыі, што цягне за сабой дысцыплінарную, адміністратыўную, крымінальную адказнасць адпаведна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь".

Суд Брэста апраўдаў Сяргея Бахуна

Суд Ленінскага раёна Брэста спыніў вытворчасць па адміністрацыйнай справе ў адносінах да кіраўніка мясцовага аддзялення "Маладога фронту" Сяргея Бахуна.

Як паведамляецца ў прэс-рэлізе "Маладога фронту", суд пачаўся напрыканцы жніўня, аднак з-за няяўкі сведак, супрацоўнікаў міліцыі, быў перанесены. Супрацоўнікі праваахоўных органаў абвінавацілі Бахуна ў правядзенні несанкцыянаванага пікета за тое, што ён распаўсюджваў газету "Весьнік Маладога фронту". У судзе і сам Бахун, і яго юрыдычны прадстаўнік Уладзімір Лабковіч звярнулі ўвагу на тое, што раздача газеты не з'яўляецца пікетаваннем, а значыць, у дзеяннях абвінавачваемага няма складу правапарушэння.

Суд пастанавіў спыніць вытворчасць па адміністрацыйнай справе ў адносінах да Бахуна і абавязаў міліцыю вярнуць яму 169 адабраных асобнікаў газеты.

Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.

Еўрапейскі Саюз дбае пра нашы правы

Еўрапейскі саюз далучаецца да заключэння, зробленага місіяй міжнароднага абмежаванага назірання на выбарах прэзідэнта Беларусі 9 верасня, і выказвае шкадаванне наконт таго, што гэтыя выбары не адпавядалі дэмакратычным стандартам АБСЕ. Такая заява прынята ў Бруселі кіраўніцтвам Еўрапейскага Саюза.

Што да далейшых узаемаадносін ЕС і Беларусі, то, як гаворыцца ў заяве, яны шмат у чым залежаць ад павагі да правоў чалавека і прагрэсу ў дэмакратызацыі краіны. У гэтым кантэксце Еўрасаюз вітае праяўленні ў Беларусі пэўнага плюралізму і грамадзянскай супольнасці, якая імкнецца да дэмакратычных перамен, што адзначыла ў сваім заключэнні міжнародная місія назіральнікаў.

ЕС выказвае надзею на тое, што Беларусь абярэ курс на палітычную лібералізацыю, павагу да правоў чалавека і вяршэнства закона. Еўрапейскі саюз будзе працягваць падтрымку дэмакратычных змяненняў і праводзіць кансультацыі з прадстаўнікамі ўсіх палітычных сіл Беларусі, калі беларускі бок гатовы ісці ў гэтым жа накірунку. "Мы падтрымліваем Кансультацыйна-назіральную групу АБСЕ, якая настойвае на такіх змяненнях", — заворыцца ў заяве Еўрасаюза.

Да гэтага дакумента далучыліся такія асацыіраваныя члены ЕС, як краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Кіпр, Мальта, Турцыя, а таксама дзяржавы — члены эканамічных арганізацый Еўрапейскага Саюза.

Наталля КУЛАГІНА.

ПАЗІЦЫЯ

Васіль БЫКАЎ:

"Жульніцкія і шулерскія прыёмы мелі месца на прэзідэнцкіх выбарах..."

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вернемся да выбараў... Упершыню падчас выбарчай кампаніі прэзідэнта беларуская дэмакратычная апазіцыя паспрабавала выкарыстаць рэсурс наменклатуры, аб'яднацца і пайсці супраць існуючага рэжыму з прадстаўнікамі былога камуністычнага чыноўніцтва. Як Вы ацэньваеце новую тактыку апазіцыі? Наколькі апраўданая была гэтая спроба?

— Я думаю, што гэтая спроба ў дадзеных гістарычных умовах была не тое што апраўданай, яна была адзіна магчымай. Таму што на каго ж яшчэ абаперціся апазіцыі? Яе нацыянальныя сілы аслабленыя, яны не могуць быць апірышчам для дэмакратычнай апазіцыі. Таму было б разумна ўзяць і наменклатуру, пэўную яе частку, якую можна было б выкарыстаць для дэмакратычных нацыянальных мэтаў. Але трэба мець на ўвазе, што Беларусь выпала з нармальнага, натуральнага гістарычнага еўрапейскага працэсу. Беларусь — гэта анамалія. І таму звычайныя меркі, якія сталі стандартамі для еўрапейскай дэмакратыі, напрыклад, альбо нават для еўрапейскай гісторыі, не дзейнічаюць для Беларусі. Таму што хада беларускай гісторыі звыродлівая, і невядома, як яе вярнуць на натуральны шлях. Мне думаецца, што толькі ў сям'і еўрапейскіх народаў — будучыня Беларусі. Але вось менавіта шлях туды — цяжкі і амаль што немагчымы — ва ўсялякім разе, у бліжэйшай будучыні.

— Васіль Уладзіміравіч, на сустрэчы з Гавелам, ацэньваючы вынікі "выбараў" у Беларусі, Вы сказалі, што Лукашэнка апусціў яшчэ на пяць гадоў грамадства ў стан агульнай дэпрэсіі. І насамрэч, тэлефануючы цяпер знаёмым у Беларусь, мы адчуваем гэты дэпрэсіўны стан. Магчыма, ён надоўга. І ўсё ж ці ёсць нейкае выйсце з гэтага стану?

— Выйсце можа быць дасягнута вось менавіта толькі працэсам, калі б адбываліся нейкія дзеянні ў накірунку да выйсця. Але ў Беларусі так не атрымліваецца. Справа ў тым, што гэта толькі некаторым павярхоўным назіральнікам здаецца, што гістарычны працэс можна перапыніць і перачакаць нейкі час, а пасля — дагнаць. На самай справе ў прыродзе няма такой стабільнасці. Нават калі мы будзем мець перыяд стагнацыі і застою, дык гэта не значыць, што беларуская гісторыя спынілася. Яна ў гэты час коціцца назад. Выйсце для яе — наперадзе, а яна коціцца назад. Таму інакш як самагубства, я не магу гэта расцаніць.

— Цяжка, відаць, наогул гаварыць пра паводзіны выбаршчыкаў ці ўжываць такія неакрэсленыя, не вельмі навуковыя тэрміны, як народ. Але можна гаварыць пра сегменты грамадства. Анатоль Лябедзька назваў адну рэч, якая яго больш за ўсё ўразіла падчас выбараў. Яго не здзівілі ні паводзіны Лукашэнкі, ні сілавых міністраў, ні людзей, якія падлічвалі галасы, але яго здзівілі паводзіны інтэлігенцыі. І ён назваў найперш такую катэгорыю — рэктары універсітэтаў, якія фактычна не далі студэнтам выявіць волю, фактычна ўдзельнічалі ў фальсіфікацыі гэтага галасавання. Яны проста не далі студэнтам галасаваць у той дзень. Роля і адказнасць інтэлігенцыі. Што ад яе засталося ў Беларусі, на Ваш погляд?

— Пра інтэлігенцыю шмат напісана і сказана, у тым ліку і пра беларускую інтэлігенцыю. Я думаю, што ў цяперашніх умовах нават няма падстаў ужываць гэты тэрмін. Калі ж гаварыць пра ВНУ, пра рэктараў нашых універсітэтаў, дык гэта абсалютны парадокс. Гэтыя людзі не садзейнічаюць развіццю грамадства, не спрыяюць адукацыі, гэта проста — "людзі ахранкі". І ўся іх дзейнасць, ва ўсялякім разе вельмі шмат каго з іх, накіравана на ўмацаванне дыктатуры. Тое самае можна сказаць (хаця гэта і не тэма нашай размовы) пра праваслаўную царкву. У наш час вельмі многія інстытуцыі набылі адваротныя якасці. Яны змянілі "плюс" на "мінус". Яны з Дабра (што было ў нашай гісторыі) пераўтварыліся ў Зло. Хаця, канешне, грамадскасць гэтага не разумее, і гэта вельмі крыўдна.

— У дні пасля выбараў шмат хто з маладых на Беларусі заяўляюць, што давучацца і потым з'едуць з "гэтай краіны", як яны кажуць, "зваляць". Сапраўды, ужо некалькі гадоў вельмі вялікі конкурс у Беларускі лінгвістычны універсітэт, і не таму, каб, як у ва ўсіх цывілізаваных краінах, ведаць замежныя мовы, а каб проста знайсці сабе месца ў той жа Амерыцы ці ў Еўропе. Ваша, Васіль Уладзіміравіч, стаўленне да гэтага працэсу?

— Сёння якраз у размове з Гавелам закраналася і гэтая праблема. Канешне, будзе масавы зыход з Беларусі на Захад, таксама, як у свой час адбываўся зыход інтэлектуалаў з Расіі ў Амерыку. Што ж, я лічу, што гэта ўвогуле іх права. І нельга патрабаваць ад моладзі, каб яна ахвяравала сваім жыццём ці, скажам, кар'ерай дзеля звыродлівых мэтаў рэжыму. Я хачу сказаць, што яшчэ ў пачатку нашай беларускай дыктатуры я звяртаўся з лістом да прэзідэнта Гавела, прасіў яго прыгадаць традыцыі буржуазнай Чэхіі, рэспубліку Масарыка, калі шмат якія беларусы, асабліва з Заходняй Беларусі, ехалі сюды, у Чэхію, дзе атрымлівалі адукацыю. Карлаў універсітэт стаў філіялам беларускай вышэйшай школы. І таму вельмі разумна і вельмі добра робіць Чэхія, яе Прэзідэнт, яе кіраўніцтва, калі дае прытулак і магчымасць набыць адукацыю нашай няшчаснай беларускай моладзі, лёс якой складаецца такім антычалавечым чынам на Радзіме.

— Васіль Уладзіміравіч, Вы прыляцелі ў Прагу з Франкфурта-на-Майне, дзе другі год жывяце, і будзе цікава даведацца — як Вам там жывецца, як Вы сябе пачуваеце?

— Жывецца ў параўнанні з маёй Радзімай, канешне, добра, у матэрыяльным сэнсе. Але і палітычная атмасфера Нямеччыны вельмі адрозніваецца ад таго, што мы маем на Радзіме. Некаторыя засцярогі маіх землякоў зыходзяць, відаць, з таго меркавання, што Нямеччына нядаўна была фашыстоўскай краінай і што там фашыстоўская ідэалогія мае нейкае значэнне ў масавай свядомасці. Я скажу, што Нямеччына свой фашызм дарэшты панішчыла, яна яго выжыла. І калі ёсць нейкія рэцыдывы — яны не застаюцца без увагі. Калі ў мінулым годзе у Нямеччыне быў забіты адзін арабскі студэнт, дык увечары, у выхадны дзень, на вуліцы Берліна прыйшло 200 тысяч дэманстрантаў супраць фашызму. Гэта, канешне, непрапарцыянальны маштаб пратэсту, але можна сабе ўявіць, як рэагуе на сваё нядаўняе мінулае нямецкае грамадства. У нас, безумоўна, такое проста немагчыма. Таму што ў нас дагэтуль камуністы ходзяць пад чырвонымі сцягамі, з партрэтамі Леніна-Сталіна, а наперадзе іх ідзе прэзідэнт Лукашэнка.

Гутарыў Аляксандр ЛУКАШУК. Радыё "Свабода", Прага.

ИЗ РОССИЙСКОЙ ПРЕССЫ

За президентскими выборами в Беларуси следили сотни зарубежных наблюдателей, журналистов, политологов... Но вы заметили — лукашенковская пропаганда тиражирует мнение только тех, кто "ничего противоправного" не заметил. Впрочем, как могли что-то заметить те, кому за счет наших налогоплательщиков были куплены билеты в оба конца, кого обхаживали так, что было, как говорится, не до наблюдений. Да многие из так называемых наблюдателей вообще не имели никаких мандатов. Почему бы им и не отблагодарить за суперщедрое гостеприимство: Лукашенко победил в честной борьбе, в Беларуси — полная демократия.

На самом деле ни о какой демократии и речи быть не может. Об этом свидетельствуют многочисленные публикации как в белорусских независимых средствах массовой информации, так и в зарубежных. В том числе — российских.

Вот что рассказали на днях "Новые Известия", пользующиеся популярностью у российской политической и деловой элиты.

Тотальная фальсификация

Александр СТАРИКЕВИЧ

Действительность иногда превосходит самые смелые ожидания. Мало кто предполагал, что выборы в Беларуси окажутся честными и демократичными, но в итоге обман оказался беспрецедентным по своей грандиозности и цинизму. Согласно сообщению Центризбиркома, за Александра Лукашенко проголосовали 75 процентов избирателей, за единого кандидата от демократических сил — 15. Нынешний глава государства якобы уверенно победил во всех регионах, включая Минск.

Данные оппозиции кардинально расходятся с центризбиркомовскими. По ее сведениям, Лукашенко получил 46% голосов, а Гончарик — 40%. То, что эта информация ближе к реальной, подтверждается протоколами с результатами голосования на тех участках, комиссии которых милостиво согласились выдать соответствующие копии. На этом основании оппозиция требует проведения второго тура.

Но власть сделала ставку на то, что она сильнее, и любые объявленные Центризбиркомом результаты белорусское общество вынуждено будет признать. Технология удержания власти в период проведения того, что в Беларуси назвали президентскими выборами, оказалась чрезвычайно простой. Ее основными составляющими стали досрочное голосование и нейтрализация независимых наблюдателей.

Досрочное голосование проходило в течение 5 дней. Организовывалось оно под предлогом удобства для избирателей, которые собирались 9 сентября куда-нибудь уехать.

В реальности все это время на участки в принудительном порядке сгоняли рабочих, служащих, студентов. Для чего? В течение всего этого времени урны находились в неохраняемом и неопечатываемом помещении. Подменить бюллетени не составляло никакой проблемы, что, по имеющейся информации, и было сделано в ночь с субботы на воскресенье. День 9 сентября был отмечен многочисленными скандалами. Многих независимых наблюдателей просто не пустили на участки для голосования.

Особенно отличилась Гродненская область. Там персонами "нон грата" объявили две трети независимых наблюдателей. Их руководителей почти весь день продержали в КГБ. После обеда в офисах демократических организаций и на квартирах их активистов были отключены телефоны. Находящийся в Гродно депутат Госдумы России Вадим Бондарь заявил, что "предвыборные технологии", использовавшиеся в Приморье во времена Наздратенко, — просто детские шалости по сравнению с белорусскими.

К подсчету голосов на большинстве участков наблюдателей просто не подпустили. Власть получила неограниченный простор для манипуляций с результатами подсчета бюллетеней. Поэтому на самом первом этапе было объявлено, что за Лукашенко проголосовали 85% избирателей. Затем, спохватившись, что выдали на-гора совершенно нереальную цифру, избиркомы всю ночь потихоньку понижали ее.

Таким образом, проблему выборов белорусские власти решили сугубо административным путем. Причем избирателей можно было и не беспокоить: все билеты (читай: бюллетени) были проданы заранее. И смех, и грех: в Речице председатель участковой комиссии съел случайно обнаруженный наблюдателями итоговый протокол, в котором уже утром 9 сентября значились результаты голосования. Чудный случай произошел на 6-м участке в Минске: количество голосов, поданных за кандидатов (2195 за всех), превысило количество бюллетеней, официально выданных участковой комиссии (2108). Следовательно, был напечатан и распространен дополнительный тираж, что является еще одним свидетельством фальсификаций со стороны властей. Кое-где (в Минске, Бресте, Сморгони...) наблюдателям, несмотря на все созданные препоны, удалось задокументировать факты махинаций с урнами, где находились бюллетени тех, кто проголосовал досрочно. Всего зафиксировано несколько тысяч нарушений, но Центризбирком даже не собирается рассматривать их, списывая все на происки конкурентов. Выборы закончены, забудьте!

Власть решила подавить оппозицию даже в виртуальном пространстве. Практически все Интернет-ресурсы, включая сайт кандидата Владимира Гончарика, которые в течение дня давали оперативную информацию о ходе выборов, были закрыты вместе со своими резервными базами.

Возникает резонный вопрос: зачем понадобилось прибегать к таким масштабным фальсификациям, когда вполне хватило бы 5—10%? Ответ кроется в природе власти Александра Лукашенко. За время этой избирательной кампании многие люди в Беларуси поверили в свое право выбора, убедились, что альтернатива существует. Для Лукашенко это представляло в перспективе огромною опасность (особенно, если учесть неизбежное дальнейшее ухудшение дел в экономике). Поэтому неприкрытая наглость была необходима, чтобы сломать тех, кто начал поднимать голову: вот вам ваш выбор, мы все равно нарисуем те цифры, которые захотим.

Хлеба и зрелищ!

Историю все реконструируют и реконструируют

В поисках развлечений на выходные многие "осели" на организованном фестивале "Заславский набат". Такое скопление народа и рыцарей городок Заславль не видел, наверное, с самого средневековья. Организованный в основном для молодежи и подростков фестиваль привлек к себе представителей всех возрастных категорий. Возможно, в некоторой степени благодаря главному спонсору — заводу "Аліварыя", чья продукция продавалась без какого бы то ни было ограничения на каждом шагу.

Фестиваль реконструировал битву князя Свидригайло и Андрея Заславского. Мстя Андрею за предательство — переход на сторону Жигимонта, князь захватил и сжег Заславль за один день.

Главные действующие лица фестиваля, рыцари, съехались со всей Беларуси. "Братство медведя", "Ойра", "Берасцейская харугва" — Брест; "Снежный барс", "Копье", "Единорог" — Минск; "Знак орла" — Бобруйск; "Дайнова" — Лида; "Ратагас" — Пинск и другие. Обещанных рыцарей из стран ближнего зарубежья не было, а некоторые из тех, кто добрался, сетовали, что помощи ни от кого не дождешься, и чтобы приехать на фестиваль, пришлось преодолеть "рыцарские" трудности.

